Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№136 (28500)
19 ЛІПЕНЯ 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 5–12



У якіх спецыялістах ёсць патрэба?



Спакой пад плітамі




Спуск у бомбасховішча
СТАР. 4

# З новым збожжам!



Фота БЕЛТА

На Гомельшчыне распачалося жніво. Камбайны працуюць на палях Брагінскага, Буда-Кашалёўскага, Добрушскага, Ельскага, Калінкавіцкага, Мазырскага, Петрыкаўскага і Хойніцкага раёнаў.

На фота: кіроўца філіяла «Советская Белоруссия» Рэчыцкага камбіната хлебапрадуктаў Валерый ВІНАГРАДАЎ назірае, як у кузаў яго машыны сыплецца збожжа новага ўраджаю.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Захоўваючы нашы традыцыйныя рынкі — Еўразійскага эканамічнага саюза, Расіі, іншых нашых партнёраў, — неабходна больш актыўна асвойваць еўрапейскі рынак і рынкі краін «далёкай дугі». Трэба пастарацца зняць па максімуме бар'еры і перашкоды для прасоўвання нашых тавараў на ўсе рынкі, як Еўразійскага эканамічнага саюза, так і Еўрапейскага саюза і іншых краін».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9521 | ▲ |
| Еўра | 2,2480 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0752 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ На слыху

## «Гарачыя» пуцёўкі... «згарэлі»

Праваахоўнікі працягваюць шукаць турыстаў, якім сталічная турфірма сарвала адпачынак

**Недзе месяц таму мінчанін Алег зусім выпадкова ўбачыў аб'яву пра «гарачую» пуцёўку ў Барселону. 11-дзённы тур для сям'і з трох чалавек каштаваў усяго 3 тысячы рублёў. Алег не мог упусціць адносна недарагую магчымасць адпачыць, таму нават узяў крэдыт у банку. У той жа дзень аформіў дагавор з турфірмай і заплаціў за пуцёўку ўсю суму. Цяпер ён мог бы ўжо купацца ў моры ды загараць на пляжы. Але замест гэтага апынуўся ў міліцыі, дзе разам з іншымі пацярпелымі напісаў заяву на дырэктара турфірмы, якая пакінула іх без адпачынку.**

Колькасць заяў на дырэктара турыстычнай фірмы «Каліпса Тур», якая ўзяла перадаплату, але не адправіла кліентаў на мора, расце з кожным днём. Сярод пацярпелых ёсць і сем'і з іншых беларускіх гарадоў. Гісторыя ва ўсіх фактычна адна. Аплацілі адпачынак у Іспаніі (ці Грэцыі, Егіпце, Турцыі, Чэхіі, Балгарыі, Кіпры), але білетаў так і не дачакаліся. Некаторыя заплацілі за пуцёўку яшчэ ў снежні, а калі прыйшоў час вылятаць, аказалася, што рэйс у графіку вылетаў не значыцца. «Мы з сястрой марылі адпачыць у Грэцыі, але паляцелі, — кажа адна з пацярпелых Аксана Ж., якая заплаціла за пуцёўку 4 тысячы рублёў. — У турфірме нам сказалі, што грошай няма, а наш тур не быў праплачаны».

Адмыслова для паездкі на мора людзі бралі адпачынкі на рабоце. Цяпер жа пра замежную вандроўку яны нават не думаюць, ім бы хоць вярнуць грошы. «Людзі працуюць, каб вывезці дзяцей на мора, каб паправіць здароўе, — кажа са слязамі на вачах Рыта А. — У майго дзіцяці парок сэрца! Чаму я павінна дарыць камусьці свае грошы?»

СТАР. 4

■ Спажывец

## АНЛАЙН-ГАНДАЛЬ БЕЗ МЕЖ



Інтэрнэт-пасылкі стануць цяжэйшыя, а ліміты павысяць?

**Інтэрнэт за апошнія пяць гадоў добра размыў межы для гандлю па ўсім свеце. Калі ў 2012 годзе сусветны тавараабарот электроннай камерцыі складаў крыху больш за 1 трлн долараў, то ў 2019 годзе чакаецца павелічэнне гэтай лічбы да 3,6 трлн і больш, удзельная вага анлайн-продажаў у аб'ёме ўсяго сусветнага рознічнага гандлю праз два гады павінна скласці каля 13%. Тавары найбуйнейшых гандлёвых інтэрнэт-пляцовак кшталту ebay, aliexpress, alibaba, amazon, taobao практычна бязмежна адпраўляюцца па ўсім свеце, што прымушае дзяржорганы задумацца аб абароне ад дэмпінгу і іншых пагроз. Разам з тым у нашай краіне ўжо зараз разглядаецца магчымасць паслаблення палажэнняў Указа №40, які летась лімітаваў атрыманне пасылак з замежжа.**

### З 264 да 2400 еўра ў год?

Цяпер у мытным камітэце краіны разглядаюцца варыянты ўніфікацыі ў Еўразійскім эканамічным саюзе бяспошлінных лімітаў на міжнародныя паштовыя адпраўленні з-за мяжы. Пакуль гаворка ідзе пра тое, каб прыйсці да адзінага абмежавання ў 200 еўра. У Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ) не супраць гэтай прапановы. Па словах **начальніка ўпраўлення арганізацыі гандлю і паслуг Віялеты БРАЗОЎСКАЙ,** у міністэрстве прапануюць павялічыць кошт пасылак да 200 еўра і 31 кг у месяц у сукупнасці. Пры гэтым адна пасылка не павінна перавышаць у суме 22 еўра і 10 кг. Гэты праект знаходзіцца на стадыі ўзгаднення.

СТАР. 2

## Экспертная група па заканадаўстве

**Пры Адміністрацыі Прэзідэнта створана група экспертаў для ўдзелу ў падрыхтоўцы найважнейшых заканадаўчых актаў, паведамляе БЕЛТА са спасылкай на Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі.**

У склад групы ўвайшлі вядомыя вучоныя і высокакваліфікаваныя практычныя работнікі. У ліку іх задач — падрыхтоўка экспертных заключэнняў пасля разгляду праектаў заканадаўчых актаў і прагназаванне вынікаў іх прыняцця. Таксама эксперты будуць распрацоўваць рэкамендацыі па ўдасканаленні заканадаўства і нарматворчай дзейнасці.

Група экспертаў будзе працаваць на грамадскіх пачатках. Экспертныя заключэнні, падрыхтаваныя па выніках яе работы, будуць выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы матэрыялаў для даклада кіраўніку дзяржавы адпаведных праектаў заканадаўчых актаў, растлумачылі ў НЦПІ.

■ Парламенцкі дзённік

# ЗАХОДНІ ВЕКТАР

## Дэлегацыя Еўрапейскага парламента прыехала ў Мінск

**Наша краіна можа іграць актыўную ролю ў абнаўленні двухбаковага дыялогу паміж Усходам і Захадам. Актывавац кантакты дапаможа маштабныя дыялог, выбудаваны па прынцыпе «Хельсінкі-2», ідэю якога прапанаваў Прэзідэнт Беларусі на адкрыцці 26-й сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Пра гэта на сустрэчы нагадаў намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Баляслаў ПІРШТУК.**

— Наша краіна безумоўна зацікаўлена ў развіцці адносін з Еўрасаюзам. Мы заўсёды з'яўляліся надзейным партнёрам з пункту гледжання не толькі падтрымання сацыяльна-эканамічнай стабільнасці ў рэгіёне, але і іншых вельмі важных пытанняў еўрапейскага значэння, — падкрэсліў Баляслаў Пірштук. — Я маю на ўвазе, перш за ўсё, ваенна-палітычную, энергетычную, экалагічную стабільнасць, барацьбу са злачыннасцю, нелегальнай міграцыяй і цэлы шэраг падобных праблем.

**Старшыня дэлегацыі Еўрапейскага парламента па сувязях з Беларуссю Багдан ЗДРАЕЎСКІ** адказаў, што самае галоўнае — гэта наладзіць дыялог. Як адзначыў спадар Здраеўскі, з іх боку асаблівая ўвага ўдзяляецца пытанням развіцця Усходняга партнёрства, а таксама адносін у рамках Парламенцкай асамблеі Усходняга партнёрства «Еўранэст». Для дасягнення больш канструктыўнага дыялогу неабходна развіваць адносіны паміж Беларуссю і еўрапейскімі інстытутамі. Так, напрыклад, было прынята рашэнне аб дадатковай падтрымцы ў развіцці Балонскага працэсу.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

■ Меркаванне



# Паміж Мінскам і Парыжам

## Беларуска-французскія адносіны: сучаснасць і будучыня

14 ліпеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне Прэзідэнту Францыі Эмануэлю Макрону і грамадзянам гэтай краіны з нагоды нацыянальнага свята Французскай Рэспублікі. У той жа дзень у Мінску прайшоў прыём з нагоды гэтай важнай даты. Прыемна было, што Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Францыі ў Беларусі Дыдзье Канес высока ацаніў ролю нашай краіны ў сферы еўрапейскай бяспекі: «Мы цэнім дапамогу Беларусі, праведзеную работу ў рамках нармандскага фармату». З боку Беларусі прывітальныя слова ўдзельнікам прагучала ад намесніка міністра замежных спраў Беларусі Алега Краўчанкі. Ён нагадаў прысутным, што сёлета мы святкуем 25-годдзе знамянальнай даты — устанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі. На думку беларускага дыпламата, за гэты перыяд мы дасягнулі сур'ёзных поспехаў у развіцці ўзаемадзеяння па многіх напрамках.

Велізарную ролю ў развіцці нашых адносін іграе французскі менталітэт. Французы вядомыя ў Беларусі як людзі душэўныя, аматары паэсіі і адпачыць, схільныя да вытанчаных мастацтваў і навук, а таксама як гасцінныя гаспадары. У Еўрасаюзе яны вядомыя тым, што актыўна абараняюць нацыянальную культуру, змагаюцца з амерыканскім уплывам і стандартызацыяй. Французская літаратура і кіно робяць краіну вельмі вядомым брэндам, і чыноўнікі Францыі яго развіваюць і абараняюць. Францыя таксама адзіная краіна «старой Еўропы», дзе няма сур'ёзных праблем з нараджальнасцю — яна знаходзіцца прыкладна на беларускім узроўні.

У сферы развіцця эканомікі вялікую ролю іграюць сумесныя мерапрыемствы, на якіх бізнесмены дзвюх краін знаёмяцца з магчымасцю двухбаковага супрацоўніцтва. Апошняе маштабнае мерапрыемства такога роду адбылося з 23 па 27 мая 2016 года ў Парыжы. У рамках беларуска-французскага дзелавога тыдня прайшлі другое пасяджэнне сумеснай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве, II Беларуска-французскі бізнес-форум і круглы стол удзельнікаў франка-беларускага дзелавога клуба. Са шкадаваннем трэба адзначыць, што ў 2016 годзе беларускі экспарт у Францыю быў самы нізкі за пяць гадоў, склаўшы 42,8 мільёна долараў. Але тое ж самае можна сказаць і пра імпарт, які знізіўся да 243,2 мільёна долараў. Пачатак 2017 года прынёс пэўнае ажыўленне ў тавараварот. Экспарт вырас у першыя чатыры месяцы года напалову, імпарт на дваццаць працэнтаў у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года.

Для Беларусі важная роля Францыі як пастаўшчыка сучаснага абсталявання, якое выкарыстоўваецца ў беларускай эканоміцы. Напрыклад, летась у Мінск былі пастаўлены тунэлепраходніцкі комплекс французскай кампаніі CSM Bessac для будаўніцтва трэцяй лініі мінскага метрапалітэна. Чакаецца, што сучаснае інавацыйнае абсталяванне дазволіць УП «Мінскметрабуд» павялічыць хуткасць будавання тунэляў у некалькі разоў.

Працяглую гісторыю мае супрацоўніцтва парламенцкай групы дружбы Францыя — Беларусь Нацыянальнай асамблеі Францыі з беларускім парламентам, якое праходзіць у рамках рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Французскай Рэспублікі. Візіты яе прадстаўнікоў у нашу краіну заўсёды шырока асвятляюцца ў беларускай прэсе і праходзяць на вельмі сяброўскай аснове.

Перспектывы развіцця нашых адносін звязаны, як і ў выпадку з Расійскай Федэрацыяй, з умацаваннем рэгіянальных адносін. Так, 27 мая 2015 года адбылося падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве і пабрацімскіх сувязях паміж гарадам Туркуэн і Партызанскім раёнам горада Мінска, у выніку чаго можна чакаць ажыўлення абмену пазітыўным вопытам двух партнёраў. Сярод гісторый паспяховага супрацоўніцтва, якія ўжо адбыліся, можна назваць адносіны Мінск — Ліён, Гомель — Клермон-Феран, Гродна — Лімож, Магілёў — Вілербан, Брэст — Брэст, Порт-сюр-Сон, Наваполацк — Шафай, Жывор. Магчыма, што ўжо ў гэтым годзе можа прайсці першы ў гісторыі Форум рэгіёнаў Беларусі і Францыі.

Як будуць развівацца адносіны з Францыяй, залежыць і ад таго, як будуць трансфармавацца ўмовы функцыянавання праграмы «Усходняе партнёрства». Гэтай восенню ў Брусэлі будзе праведзены саміт, на якім плануецца сур'ёзна перагледзець праграму. Хочацца спадзявацца, што новыя ўмовы адкрыюць яшчэ больш магчымасцяў для канструктыўнага супрацоўніцтва дзвюх краін.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

# АНЛАЙН-ГАНДАЛЬ БЕЗ МЕЖ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Раней на працягу аднаго месяца без выплаты мытных пошлін з-за мяжы можна было атрымліваць пасылкі з таварамі на суму ў 200 еўра і вагой у 31 кг. Летась агульны кошт тавараў ужо не павінен быў перавышаць 22 еўра, а агульная вага — 10 кг. Калі ліміт па кошце за месяц перавышаны, то неабходна заплаціць пошліну ў 30% ад перавышэння сумы. Акрамя таго, за кожную такую пасылку спаганяецца мытны збор у памеры пяць еўра. За кожны кілаграм звыш ліміту спаганяецца пошліна ў чатыры еўра. Пошліны за перабор па вазе і за перавышэнне кошту адначасова не выплачваюцца — выбіраецца больш вялікая па суме.

### Падатковая свабода для інтэрнэт-гандляроў

«Плюшкі» ад МАРГ на гэтым не сканчаюцца. Беларускі інтэрнэт-бізнес таксама чакае выгадная перспектыва. Міністэрства прапануе адмяніць забарону на прымяненне спрошчанай сістэмы падаткаабкладання для інтэрнэт-крамаў. Па словах Віялеты Бразоўскай, падрыхтаваны шырокамаштабны пакет дакументаў па лібералізацыі ўмоў вядзення бізнесу. Прапанова па адмене забароны на прымяненне спрошчанай сістэмы падаткаабкладання для інтэрнэт-крамаў зроблена з улікам таго, што палова інтэрнэт-крамаў належыць індывідуальным прадпрымальнікам. А спрошчаная сістэма падаткаабкладання найбольш зручная менавіта для «іпэшнікаў».

Дарэчы, па стане на 1 ліпеня ў Беларусі зарэгістравана больш за 15 тысяч інтэрнэт-крамаў, з іх 51% належыць індывідуальным прадпрымальнікам. Найбольшая частка з іх зарэгістраваная ў Мінску і Мінскай вобласці. За апошнія пяць гадоў колькасць анлайн-гандляроў вырасла больш чым у 3,5 раза.

Як адзначыла Віялета Бразоўская, у Беларусі павялічваецца і аб'ёмы продажу праз сеціва. З 2010 па 2016 гады тавараабарот інтэрнэт-гандлю вырас у 25,8 раза. У 2010 годзе доля электроннай камерцыі ў рознічным тавараабароце складала 0,5%, а ўжо на пачатку 2017-га — 2,8%. Цалкам кансерватыўнымі застаюцца пакупкі беларусаў, якія сваім перавагам не здраджваюць. У 80% выпадках яны купляюць электрапрыборы, дэталі, трыкатажныя вырабы, парфумерыю, касметыку, верхняе адзенне.

Віялета Бразоўская таксама адзначыла, што айчынныя вытворцы сталі больш актыўна карыстацца інтэрнэт-прасторай і ствараць свае інтэрнэт-крамы. «Акрамя таго, выкарыстоўваюцца рэсурсы інтэрнэт-крамы «Белпошты». На іх сайце прадстаўлена больш за 217 айчынных вытворцаў, а летась пакупнікі зрабілі больш за 45 тысяч заявак», — растлумачыла начальнік упраўлення МАРГ.

Сярод асноўных кірункаў развіцця інтэрнэт-гандлю ў Беларусі сёлета Віялета Бразоўская назвала далейшае адкрыццё інтэрнэт-крамаў, у тым ліку айчынных вытворцаў, узмацненне ролі дзяржавы ў ахове правоў спажыўцоў, развіццё рэгіянальнай



лагістыкі, паскарэнне і патанненне дастаўкі, павелічэнне долі пакупак праз мабільныя сэрвісы, планшэты, развіццё інтэрнэт-рамаў у сімбіёзе з інтэрнэт-пляцоўкамі.

### Спіс парушальнікаў

У краіне працуюць над тым, каб размясціць інфармацыю аб нядобрасумленных інтэрнэт-крамах на спецыяльным рэсурсе. Па словах **выканаўчага дырэктара асацыяцыі кампаній інфармацыйных тэхналогій (АКІТ) Дзмітрыя АНАНЬЕВА**, яго канцэпцыя распрацоўваецца ўжо зараз. Стваральнікі ставяць мэтай зменшыць рызыкі для пакупнікоў пры ўзаемадзеянні з інтэрнэт-крамамі.

«На шматлікіх інтэрнэт-пляцоўках можна ўбачыць, як правіла, толькі станоўчыя водгукі. У беларускім рэсурсе будуць сабраныя інтэрнэт-крамы, якія парушаюць заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў, гандлю, прадпрымальніцкай дзейнасці, падатковае заканадаўства. Там таксама будуць рэкамендацыі для спажыўцоў, меркаванне экспертаў у форме пытанняў-адказаў», — растлумачыў Дзмітрый Ананьеў. Канцэпцыя рэсурсу будзе абмяркавана з МАРГ і Міністэрствам па падатках і зборах.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Пагромы падчас саміту ў Гамбургу абышліся ў 12 млн еўра



Асацыяцыя нямецкіх страхоўшчыкаў ацаніла страты ад пагромаў у Гамбургу падчас правядзення саміту лідараў краін «Вялікай дваццаткі» ў 12 мільёнаў еўра, паведамляе Bild. Чатыры мільёны еўра складуць выплаты ўладальнікам дзясяткаў спаленых вандаламі аўтамабіляў. Яшчэ ў восем мільёнаў ацэньваецца шкода, нанесеная крамам, кавярням і жылым дамам.

14 ліпеня 71-гадовы дэпутат федэральнай зямлі Мекленбург-Пярэдняя Памеранія Крыстэль Вайсіг прапанавала расстраляць удзельнікаў беспарадкаў у Гамбургу. «Пагромшчыкаў трэба было б расстрэльваць на месцы, чаму мы не дазваляем гэта рабіць?» — задалася яна пытаннем.

Кожны дзень саміту G20 суправаджаўся жорсткімі акцыямі пратэсту, у якіх удзельнічалі звыш 10 тысяч антыглабалістаў, у тым ліку левых экстрэмістаў. Яны закідвалі вартавых парадку бутэлькамі, камянямі, падпальвалі аўтамабілі і пакрышкі.

## ЗША выпрабавалі лазерную гармату

ЗША правялі ў Персідскім заліве выпрабаванні новага віду зброі — лазернай сістэмы LaWS. У ходзе выпрабаванняў ваенныя збілі беспілотнік, паведамляе тэлеканал CNN, журналісты якога сталі сведкамі падзеі.

Тэлеканал сцвярджае, што гэта «першая ў свеце актыўная лазерная зброя». Адзначаецца, што гаворка ідзе не пра эксперыментальны ўзор, а пра паўнавартасную зброю, гатовую да выкарыстання ў любы момант. Акрамя дрона, лазер таксама паспяхова знішчыў невялікія мішэні на борце рухомага карабля. Ваенныя адзначаюць, што ў параўнанні з іншымі відамі зброі, LaWS валодае цэлым шэрагам пераваг. Так, напрыклад, стральба з яе не патрабуе папярэдняй падрыхтоўкі, LaWS здольная паражаць аб'екты «з хуткасцю святла» і з'яўляецца ў 50 тысяч разоў хутчэйшай за міжкантынентальныя балістычныя ракеты. Стрэл з устаноўкі робіцца бязгучна і непрыкметна, таму што гармата дзейнічае ў нябачнай частцы электрамагнітнага спектра. Пры гэтым няма неабходнасці ні ў якіх боепрыпасах. Гармата выстрэльвае фатонамі, якія пры кантакце з мішэнню награваюць яе да некалькіх тысяч градусаў. Яе кошт складае каля 40 мільёнаў долараў, а кошт аднаго стрэлу роўны прыкладна аднаму долару.



## Якая сярэдняя сума хабару ў Маскве

Сярэдняя сума хабару ў выяўленых сталічнымі паліцэйскімі эпізодах карупцыі склала 614 000 рублёў (каля 20 200 беларускіх рублёў) за першыя паўгода 2017-га. Гэтую лічбу агучыў на пасяджэнні калегіі глаўка МУС па Маскве яго кіраўнік Алег Баранаў, перадае РІА Навіны.

Паводле яго слоў, раскрывальнасць падобных злачынстваў вырасла на 22%. Па звестках на 2016 год, сярэдняя сума хабару ў Расіі склала каля 200 тысяч рублёў, а ў 2015-м — 188 тысяч.

У чэрвені 2017 года камітэт Дзярждумы па бяспецы і супрацьдзеянні карупцыі падрыхтаваў папраўкі ў Крымінальны кодэкс, якія прадугледжваюць узмацненне жорсткасці пакарання за дачу і атрыманне хабару. Тэрмін пазбаўлення волі за падобнае злачынства прапануецца павялічыць да чатырох гадоў.

Славянскі базар у Віцебску

# Да пабачэння і спаткання

**Канцэрт закрыцця «базару» ў панядзелак стаў разыначкай на галоўным торце багатага фестывальнага меню. Тыя, хто бачыў трансляцыю, упэўнены, пагодзяцца. «Зорны дэсант» шоу практычна не саступаў па ўзроўні вядомасці і папулярнасці аналагічнаму, які выступіў на канцэрце адкрыцця. Светлавыя эфекты зачароўвалі. А самыя галоўныя «барометры» ацэнкі якасці падзеі — білеты — раскупілі задоўга да пачатку фэсту.**



Фота БЕЛТА.

Глядач, такім чынам, прагаласаваў рублём, а дакладней — авансаваў. Як і ў мінулыя гады, канцэрты адкрыцця і закрыцця «базару» раскупляюцца ў першую чаргу.

У дырэкцыі адзначаюць, што з кожным годам усё больш білетаў набываецца праз інтэрнэт. І геаграфія краін, адкуль былі зроблены пакупкі, пашыраецца.

А сёння,19 ліпеня, у Віцебску апошні фестывальны дзень. Кропку ў праграме «Славянскага базару» паставіць позна вечарам гурт «Сплін».

Дарэчы, як вядома, слова «сплін» азначае роспач, маркота, тужлівы настрой. Пасля «базару» адчуваецца, бадай, зусім іншае. Напэўна, не памылюся, калі скажу, што гэта — стомленасць. І зразумела: як яшчэ адчуваць сабе пасля 10-дзённага святочнага марафону?

«Сакрэт» базару ў тым, што нават і пасля неафіцыйных дзён можна «пабываць на ім». Напрыклад, па-ранейшаму, працуюць некаторыя фестывальныя выставы.

У СМІ абавязкова вы яшчэ шмат чаго прачытаеце пра «базар». І вядучыя тэлевізійных каналаў, падводзячы вынікі тыдня, безумоўна, нагадаюць пра фестываль. Канешне, ёсць і тыя, каму «базар» не падабаецца. Але ў дырэкцыі вельмі ўважліва вывучаюць крытычныя заўвагі, негатыўныя водгукі. Пра гэта сёлета на прэс-канферэнцыі адкрыцця нагадаў кіраўнік дырэкцыі Аляксандр Сідарэнка.

З пункту гледжання прагматыкаў, «базар» як брэнд незалежнай Беларусі працуе і на эканоміку нашай краіны. Павелічэнне колькасці турыстаў, дадатковы інтарэс інвестараў — заслуга арганізатараў фестывалю. Безумоўна, яго штогадовае правядзенне на нязменна высокім узроўні стала магчымым, дзякуючы падтрымцы кіраўніцтва краіны і асабіста Прэзідэнта.

А ў дырэкцыі зноў жа па добрай традыцыі ўжо працуюць над чарговым, 27-м па ліку фэстам.

У любым выпадку цяжка ўявіць сабе Віцебск і Беларусь без «базару». Хто ведае, можа ў яго будзе такі ж лёс, як у Алімпійскіх гульняў? Мо ён пераўтворыцца ў нейкі новы фестываль? Час пакажа!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## ■ Рэкорды прыёмнай кампаніі

# ЗА НЕКАЛЬКІ КРОКАЎ ДА МАКСІМАЛЬНАГА БАЛА

## Новыя маячкі, на якія давядзецца арыентавацца абітурыентам 2018 года

**Спрашчэнне тэстаў, пра якое казалі як сёлетнія выпускнікі, так і рэпетытары, якія здзейснілі «разведку боем» і таксама паўдзельнічалі ў ЦТ, не магло не адбіцца на росце прахадных балаў. Вялікая колькасць уладальнікаў максімальных і вельмі высокіх балаў ЦТ абумовіла надзвычай вострую канкурэнцыю паміж імі, асабліва на прэстыжных у моладзі спецыяльнасцях. На некаторых з іх прахадныя балы сёлета проста зашкальваюць...**

Так, на факультэт міжнародных адносін у БДУ падалі дакументы 9 абітурыентаў, якія маюць у суме больш як 391 бал, і 29 чалавек, якія маюць больш за 381 бал.

На юрыдычным факультэце больш як 381 бал маюць 10 чалавек, такія ж вынікі ёсць і сярод тых, хто паступае на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, механіка-матэматычны, хімічны і філалагічны факультэты, факультэт філасофіі і сацыяльных навук, радыёфізікі і камп'ютарных тэналогій, у Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій...

Усяго на дзённую бюджэтную форму навучання ў Белдзяржуніверсітэт было пададзена ад абітурыентаў 4433 заявы (летась — 3585) пры плане прыёму 2164 чалавекі (летась — 2207). Такім чынам, сярэдні конкурс па ўніверсітэце перавысіў 2 чалавекі на месца.

Сярод тых, хто падаў дакументы, без экзаменаў будуць залічаны 66 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, 3 лаўрэаты Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Увогуле вынік вышэй за 300 балаў маюць 51,4% ад агульнай колькасці абітурыентаў БДУ. Сярод іх 92 абітурыенты, якія атрымалі на ЦТ 100-бальны вынік, а ў шасці абітурыентаў — два стабальныя сертыфікаты.

Па словах **адказнага сакратара прыёмнай камісіі БДУ Вячаслава МАЛАФЕЕВА,** усюды прахадныя балы будуць вышэйшыя за леташнія. На шэрагу спецыяльнасцяў скачок да мінулага года можа быць у раёне 100 (!) балаў. У ліку топавых сёлета спецыяльнасці факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і хіміка-біялагічнага профілю. «У цэлым можна сказаць, што ў дыяпазоне сярэдніх балаў ад 220 да 300 прырост прахадных балаў у параўнанні з мінулым годам дасягае 30—50 пунктаў. На топавых спецыяльнасцях, дзе прахадныя балы складалі раней 350 і вышэй, таксама адбыўся істотны рост», — адзначыў Вячаслаў Малафееў. Нагадаем, што летась прахадны бал на ФМА вагаўся, у залежнасці ад спецыяльнасці, ад 361 («менеджмент у сферы міжнароднага турызму») да 382 («міжнародныя адносіны», «міжнароднае права») з 400 магчымых.

У Мінскім дзяржаўным медыцынскім універсітэцэ на лячэбны факультэт падалі дакументы 5 абітурыентаў, якія маюць больш як 391 бал, 24 абітурыенты, у якіх больш як 381 бал, і 50 чалавек, якія набралі больш як 371 бал. На стаматалагічным факультэце двое маюць больш як 391 бал і 7 чалавек — больш як 381 бал.

Абітурыенты з сумай балаў больш як 391 ёсць таксама і ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце на перакладчыцкім факультэце. Між іншым, ужо ўчора на сайце гэтай ВНУ з'явіліся спісы рэкамендаваных да залічэння на бюджэтную форму навучання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Музычная паўза

## Канцэрт брытанскага гурта Depeche Mode быў адменены за гадзіну да пачатку

**Гэта адбылося таму, што саліст групы Дэйв Гаан захварэў. Паводле інфармацыі партала tut.by, артыст быў шпіталізаваны з-за праблем са страваваннем яшчэ а палове чацвёртай дня, аднак толькі да 18 гадзін стала зразумела, што канцэрт не адбудзецца. Дэйв Гаан быў накіраваны ў 9-ю гарадскую клінічную бальніцу сталіцы.**



Тым жа вечарам на афіцыйнай старонцы гурта ў сацыяльнай сетцы Facebook з'явілася спецыяльнае паведамленне. Музыканты папрасілі людзей адсочваць інфармацыю, паколькі «ў цяперашні час мы праглядаем усе варыянты, каб перанесці гэтае шоу». Магчыма, рашэнне аб пераносе або вяртанні білетаў адновіцца на наступным тыдні, адзначаецца ў заяве групы. Удзельнікі гурта прынеслі свае прабачэнні і падзякавалі прыхільнікам за разуменне і цярпенне.

Дэйв Гаан правёў у бальніцы толькі ноч — ужо наступнай раніцай артыст быў агледжаны і падрыхтаваны да выпіскі. Паводле інфармацыі БЕЛТА, урачы ацэньваюць стан музыканта як здавальняючы. Адзначаецца, што Дэйв Гаан знаходзіўся ў нармальным настроі і размаўляў з урачамі. Іншая інфармацыя не прыводзіцца, паколькі звесткі маюць асабісты характар.

Вядома, з-за адмененага канцэрта надзвычай знерваваліся фанаты. Па словах мінчанкі Ганны ПЯРОВАЙ, «сёння гэта адзіная група ў свеце, якая змагла пабудаваць вакол сябе культ». Для дзяўчыны гэта павінен быў быць ужо чацвёрты канцэрт Depeche Mode.

— Ці буду я здаваць білет? На самай справе, я ўжо купляла білет гурта ў Вільні ў 2009 годзе, і тады ў Дэйва таксама былі праблемы з жыватом, — успамінае Ганна. — У выніку тады адмянілі частку тура. Арганізатары сказалі тое ж, што і цяпер, але потым вярнулі грошы, проста таму, што Depeche Mode ніколі не пераносіць свае канцэрты. Таму буду чакаць, што скажуць арганізатары. Калі іх можна будзе здаць на працягу двух месяцаў, то буду чакаць да апошняга.

Па словах дзяўчыны, некаторыя прыхільнікі гурта сустрэлі навіну аб адмене канцэрта слязамі. «Магчыма, яны прыехалі здалёк і патрацілі вельмі шмат грошай, — дадала Ганна. — Я пазнаёмілася з хлопцамі і дзяўчатамі, якія прыехалі за некалькі тысяч кіламетраў дзеля канцэрта. Я думаю, яны яшчэ не ўсвядомілі маштаб таго, што адбылося, патрацілі па 2 тысячы долараў кожны, каб прыехаць. У іх вельмі разгубленыя стан, бо яны ўпершыню паехалі на канцэрт Depeche Mode».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

ВТБ

**ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)**

**Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14**

Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
### на 1 июля 2017 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 32 298 | 28 550 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 70 345 | 98 976 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 76 238 | 110 795 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 331 263 | 288 321 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 551 233 | 620 271 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 997 | 997 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 46 340 | 47 483 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 5 406 | 1 967 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | 494 |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 7 820 | 14 070 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 1 121 940 | 1 211 924 |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | 116 957 | 237 035 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 835 826 | 777 981 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 206 | 21 451 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 587 | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 18 797 | 20 200 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 972 373 | 1 056 667 |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 77 962 | 77 962 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | 3 432 | 3 432 |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 8 695 | 7 854 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 30 442 | 30 458 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 29 036 | 35 551 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 149 567 | 155 257 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 1 121 940 | 1 211 924 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
### на 1 июля 2017 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 67 214 | 103 634 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 23 967 | 49 024 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 43 247 | 54 610 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 16 199 | 25 858 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 2 152 | 3 574 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 14 047 | 22 284 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 65 | (29) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 9 417 | 9 719 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (4 599) | (4 173) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 21 845 | 45 485 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 2 675 | 5 219 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 29 461 | 27 736 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 1 049 | 1 290 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 12 497 | 13 119 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 2 361 | 2 667 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 10 136 | 10 452 |

Председатель Правления В. В. Иванов

Главный бухгалтер М. В. Дудко

Дата подписания 6 июля 2017 г.

**Финансовая отчетность на 1 июля 2017 г. в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: www.vtb-bank.by**

УНП 101165625

## ■ Здарэнні

# НЕБЯСПЕЧНАЕ ВАРЭННЕ

**Летняя нарыхтоўка закрутак можа абярнуцца сур'ёзнымі праблемамі. Прычым справа далёка не заўсёды крыецца ў саміх дарах прыроды. Днямі жыхарка сталічнай вуліцы Шышкіна ледзь не загінула з-за... варэння. Позна вечарам да ратавальнікаў паступіла паведамленне аб задымленні ў яе кватэры. Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, па знешніх прыкметах нічога незвычайнага не назіралася.**

Як паведамляюць у прэс-службе ведамства, падчас высвятлення абставін было ўстаноўлена, што ў кватэры на трэцім паверсе дома адбылося загаранне ежы. На электрычнай пліце без увагі было пакінута варэнне. Работнікамі МНС была выратавана неабачлівая гаспадыня — яна знаходзілася на канапе ў жылым пакоі, была ў прытомнасці, але самастойна ўстаць не магла. Пасля агляду жанчыны брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі шпіталізацыя не патрабавалася. Пажар лакалізавалі і ліквідавалі ратавальнікі. Ім пашкоджана (закурана) кухня ў кватэры.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*




# ДА ДВУХ СУТАК ПАД ЗЯМЛЁЙ




## Куды схавацца жыхару мегаполіса ў выпадку прыроднага ці тэхнагеннага катаклізму

**Адно з вялікіх бамбасховішчаў у Мінску знаходзіцца на тэрыторыі трамвайнага парка па вуліцы Батанічнай. Сярод іншага, яно мае і багатую гісторыю. Яго пачалі ўзводзіць яшчэ ў савецкія часы. Але грымнулі 90-я, грошай не стала, і будоўлю давялося закансерваваць на некалькі гадоў. У рэшце рэшт у 2005 годзе бамбасховішча ўсё ж запрацавала. Парк зрабіў у ім сучасны рамонт і цяпер выкарыстоўвае для заняткаў з супрацоўнікамі. Карэспандэнт «Звязды» спусціўся ў сутарэнне, каб даведацца, як выглядае знутры гэты важны аб'ект, які, дасць бог, ніколі ў жыцці не спатрэбіцца, але які павінен быць заўсёды падрыхтаваны да надзвычайных сітуацый.**



Вядучы інжынер па грамадзянскай абароне і надзвычайных сітуацыях філіяла «Трамвайны парк» ДП «Мінсктранс» Віктар СІНКЕВІЧ і намеснік начальніка аддзела арганізацыйнага забеспячэння Дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый і грамадзянскай абароны МНС Беларусі Аляксандр РЫБАК.

### Як у Жуля Верна

— Рыхтуйцеся да зацяжнога спуску, — папярэджвае **вядучы інжынер па грамадзянскай абароне і надзвычайных сітуацыях філіяла «Трамвайны парк» ДП «Мінсктранс» Віктар СІНКЕВІЧ.**

Пад зямлю вядуць некалькі дзясяткаў прыступак, падзеленых на маршы. Тунэль нечакана паварочвае на 90 градусаў улева. Масіўныя герметычныя жалезныя дзверы адкрываюцца з дапамогай ключа і паваротнага механізма. За імі — шлюз. Гэтаксама працуюць і другія дзверы, за якімі і знаходзіцца само сховішча.

— Такі тамбур патрэбны на выпадак хімічнай аварыі, — кажа Віктар Сінкевіч. — Калі людзі, якія знаходзяцца ў памяшканні, вырашаць выйсці на двор, яны спярша мусяць упэўніцца, што з паветрам «за бортам» усё добра. А для гэтага неабходна зрабіць замеры. Зачыніўшы за сабой адны дзверы, чалавек перашкаджае таму, каб падчас гэтай працэдуры атручанае паветра пранікла ўнутр сховішча.

А ўнутры сховішча ўяўляе сабой, на першы погляд, вялікі школьны вучэбны клас. На сценах развешаны плакаты, прысвечаныя тэме грамадзянскай абароны. У «галаве» памяшкання — карта Беларусі, радыёапаратура. Ззаду стаяць лаўкі і двухмесны двух'ярусны ложак. А побач з імі частка памяшкання абгароджана белай шырмай — там прадугледжаны медыцынскі пункт... У памяшканні халаднавата — тэмпература тут складае роўна 15 градусаў.

— На тэмпературу ўвагу не звяртайце, — заўважае Віктар Сінкевіч. — Арыентуйцеся на гігрометр. Самае галоўнае — гэта вільготнасць, якая ўплывае на стан і работу механізмаў... Тут у нас можа размясціцца 250 чалавек. Зусім нядаўна, 25 мая, мы праводзілі камандна-штабное і тактыка-спецыяльнае вучэнне. Да таго ж у нас працуе і спецыяльная група, якая абслугоўвае сховішча. У яе лік уваходзяць прадстаўнікі розных прафесій, сярод якіх ёсць электрыкі і сантэхнікі. Як кажуць, порах варта трымаць сухім...

Але схаваць людзей пад некалькімі метрамі бетону мала. Трэба яшчэ паклапаціцца і аб тым, каб працяглы час — да двух сутак — яны там змаглі знаходзіцца...

— Мы з вамі знаходзімся ў фільтравальна-вентыляцыйнай камеры, — працягвае экскурсію Віктар Сінкевіч. — Заўважце, што акрамя электраправадаў, разлічаных на падачу паветра, тут ёсць і ручныя механізмы на выпадак перабояў. Паветра «са двара» праходзіць праз спецыяльную ёмістасць. У сховішчы прадугледжана і магчымасць поўнай рэгенерацыі паветра з дапамогай спецыяльных патронаў. Нешта падобнае апісваў яшчэ Жуль Верн. А цяпер гэта — рэальнасць.



Гэтая постаць сустракае ўсіх, хто спускаецца ў бамбасховішча.

Насупраць камеры — гаспадарчае памяшканне. Там знаходзяцца стэлажы з ёмістасцямі для ежы, кухонны інвентар. Адведзена месца і пад запас прадуктаў. І, канешне ж, назапашаны бінты, медыкаменты. Устаноўлены і вялізныя ёмістасці з вадой.

### «Бяспечныя раёны», сховішчы, метро...

— З цягам часу падыходы да грамадзянскай абароны мяняліся, — расказвае **намеснік начальніка аддзела арганізацыйнага забеспячэння Дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый і грамадзянскай абароны МНС Беларусі Аляксандр РЫБАК.** — Цяпер найбольш эфектыўным спосабам лічыцца эвакуацыя. Яна скіравана на часовае адсяленне людзей, перамяшчэнне ў бяспечнае месца матэрыяльных і гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Таму, акрамя збудаванняў грамадзянскай абароны, у Мінску створаны так званыя бяспечныя раёны. Гэта тэрыторыя, якая не трапляе ў зону магчымай небяспекі — скажам, разбурэнняў, затапленняў, хімічнага або радыяцыйнага забруджвання. Выканаўчыя і распарадчыя органы могуць часова размяшчаць людзей у грамадскіх і адміністрацыйных будынках вялікай умяшчальнасці. Гэта санаторыі, гасцініцы, школы, пансіянаты...

Напрыклад, у Ізраілі грамадзянская абарона выведзена на агульнадзяржаўны ўзровень. А тэматычныя вучэнні ахопліваюць усё насельніцтва краіны. Усе школы, дзіцячыя садкі, жылыя дамы абавязкова будуюцца са спецыяльным абарончым пакоем. І таму шанц таго, што людзі пацерпяць у выпадку надзвычайнай сітуацыі, тут мінімальны.

А што ж у сталіцы? У Мінску цяпер налічваецца каля тысячы збудаванняў грамадзянскай абароны. Яны размешчаны як на прадпрыемствах, так і ў жылым сектары. Большая частка з іх была ўзведзена ў 50—60-я гады. Збудаванні прызначаны для таго, каб схаваць людзей не толькі ў асобы перыяд, але і ад прыродных ды тэхнагенных надзвычайных сітуацый. Акрамя таго, для магчымага ўкрыцця ў Мінску можна выкарыстоўваць больш за 2500 падвальных памяшканняў. Не варта спісваць з рахунку і 29 станцый сталічнага метрапалітэна. Хоць ён у нас і не такі глыбокі, як у Маскве ці Санкт-Пецярбургу, але ад небяспекі ўсё ж уратуе.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

## ЯКОЕ ЛЕТА БЕЗ САНАТОРЫЯ...

**Санаторна-курортныя арганізацыі запоўнены цяпер фактычна цалкам, аднак калі ёсць жаданне адпачыць і прайсці аздараўленне ў наступным месяцы, то сёе-тое яшчэ можна знайсці.**

Паводле слоў **дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзя БАЛБАТОЎСКАГА,** санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі стабільна працавалі ў першым паўгоддзі — запаўненне ў іх супастаўнае з аналагічным перыядам мінулага года, у цэлым дзесьці больш за 70 працэнтаў. З выкарыстаннем сродкаў бюджэту і дзяржаўнага сацыяльнага страхавання адпачылі сёлета 380 тысяч грамадзян.

За 1-ю і 2-ю змены каля 100 тысяч дзяцей прайшлі аздараўленне ў лагерах кругласутачнага знаходжання і каля 200 тысяч — у лагерах дзённага знаходжання. Без экстранных сітуацый адпрацавалі ў 1-ю і 2-ю змены каля пяці тысяч гэтых устаноў. Кошт пуцёўкі ў 1-ю змену ў кругласутачным лагеры склаў за 18 дзён 380 рублёў, у спартыўным лагеры з кругласутачным знаходжаннем за 18 дзён — 420. На 4-ю змену яшчэ нават можна набыць пуцёўку. У першым паўгоддзі вырасла свабодная рэалізацыя пуцёвак, у тым ліку па экспарце паслуг, які павялічыўся прыкладна на 10 працэнтаў да ўзроўню мінулага года.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

## КРАІНЕ — ПОСТЫНДУСТРЫЯЛІЗМ, ВАКЗАЛУ — WI-FI

**Ідэя зрабіць Wi-Fi на чыгуначных вакзалах нарэшце не пакінула ў баку і прадстаўнікоў Беларускай чыгункі. Плануецца, што з 25 ліпеня ўсе вакзалы краіны павінны афіцыйна пагрузіцца ў лічбавую нірвану.**

Нагадаем, што Беларуская чыгунка сумесна з СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» з 10 ліпеня ў тэставым рэжыме арганізавала бясплатны доступ да інтэрнэту па тэхналогіі Wi-Fi на чыгуначных вакзалах. Хот-споты (тыя самыя месцы, дзе магчыма зайсці ў сецiва) сеткі Wi-Fi з'явіліся ў залах чакання і холах на чыгуначных вакзалах у Мінску, Оршы, Маладзечне, Барысаве, Баранавічах, Лідзе, Гродне, Лунінцы, Пінску, Гомелі, Жлобіне, Калінкавічах, Магілёве, Асіповічах, Бабруйску, Крычаве, Віцебску і Полацку. І там усё сур'ёзна — хуткасны доступ у сеціва забяспечваецца пры дапамозе тэхналогіі 4G і аптычных каналаў сувязі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

# «Гарачыя» пуцёўкі...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У сітуацыі з «Каліпса Тур» цяпер разбіраюцца праваахоўныя органы. Паводле слоў **афіцыйнага прадстаўніка Кастрычніцкага РУУС Мінска Эвеліны МАРКОЎСКАЙ,** у міліцыю з заявамі ўжо звярнулася больш за 70 пацярпелых. Гэта непасрэдна тыя людзі, якія складалі дамовы з названай турфірмай (значыць, можна меркаваць, што за заявамі, якія паступілі, стаіць не менш як сто пацярпелых. Гэта члены сем'яў тых, хто падпісаў дамову з турфірмай). Акрамя таго, у Кастрычніцкае РУУС Мінска звярнуліся таксама прадстаўнікі дзвюх юрыдычных асоб. Папярэдне, сума ўрону, нанесенага турыстам, складае 158 тысяч рублёў. У праваахоўнікаў ёсць падставы меркаваць, што колькасць пацярпелых можа быць большай. Таму і просяць тых, хто заключаў дагавор аб аказанні турыстычных паслуг з ТАА «Каліпса Тур» і ІП «Борздый Е. Г.», звяртацца па тэлефонах: 8 (017) 239-64-73, 8 (017) 226-21-05, 8 (029) 562-76-93.

Некалькі дзён таму карэспандэнту АНТ удалося пагаварыць па тэлефоне з дырэктарам «Каліпса Тур». Юлія Антаневіч (менавіта яна, са слоў пацярпелых, прадавала ім туры) запэўніла, што кампанія верне грошы людзям на працягу 30 дзён. Аднак 15 ліпеня, калі была прызначаная сустрэча, яна на званкі не адказвала. Учора стала вядома, што некалькім кліентам «Каліпса Тур» ужо вярнула грошы за пуцёўкі, але пра масавыя выплаты гаворка пакуль не ідзе. Тым часам Юлія Антаневіч дала каментарый тэлеканалу Беларусь 1 (здымкі рабілі са спіны): «Проста так склалася, што людзі прыйшлі ў адзін і той жа час, паднялі крык ды гоман. На наступны дзень у нас у офісе сабралася каля 20 чалавек з просьбай «мы не хочам ляцець, мы хочам скасавання дагавораў». Відавочна, выплаціць грошы ды скасаваць дагавор мы не можам у тую ж секунду. Гэта вельмі складана. Тым больш па некаторых турах прадугледжаны штрафы. Я ім сказала, што не магу нічога зрабіць, маўляў, можаце звяртацца ў міліцыю. У далейшым усе нашы заяўкі былі наогул ануляваны. На жаль, цяпер ніхто ўжо не можа вылятаць ад нас».

Акрэсленую праблему актыўна абмяркоўваюць у сацыяльных сетках. Адвакаты, якія працуюць з падобнымі справамі, лічаць, што добра было стварыць кампенсацыйны фонд пры грамадскіх арганізацыях, які б у выпадку неаказання турпаслуг кампенсаваў урон сваім чальцам-турыстам.

У нашай краіне няма ліцэнзавання ў сферы турыстычных паслуг. Замест яго існуе рэестр тураператараў (гэта спіс кампаній з добрай рэпутацыяй, цяпер там больш як 700 фірмаў). Меркавалася, што гэты спіс абароніць турыстаў ад непрыемнасцяў. Атрымалася ж, што з адменай дзяржаўнага рэгулявання ў турыстычную сферу маглі трапіць і выпадковыя людзі. Толькі летась у Беларусі былі скандалы з некалькімі буйнымі фірмамі, як правіла, філіяламі расійскіх кампаній, якія абанкруціліся.

**Надзея ДРЫЛА.**
*dryla@zviazda.by*

**Ганна МУХА, начальнік аддзела маркетынгу і якасці турысцкіх паслуг дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:** «Мы раім беларусам уважліва ставіцца да выбару турфірмы і афармлення дагавора. Старанна правярайце стаж работы кампаніі на рынку, прадае яна ўласны прадукт ці пуцёўкі іншых кампаній за агенцкае ўзнагароджанне, пагледзьце водгукі. Акрамя таго, варта ўважліва вывучыць умовы дагавора, які заключаецца (турфірмы ў дамове могуць прадугледзець тузін агаворак, каб выходзіць сухімі з вады). У сёлетнім турыстычным сезоне зафіксаваныя адзінкавыя звароты з нагоды якасці турпаслуг. Адзін з апошніх датычыўся пражывання ў гатэлі на востраве Крыт — турыстаў не задаволілі ўмовы размяшчэння. Пасля ўмяшання Мінспорту туркампанія аператыўна вырашыла пытанне. Такіх выпадкаў, як з «Каліпса Тур», каб турысты заплацілі грошы і не адправіліся ў паездку, з іншымі фірмамі ў гэтым сезоне не было».

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 3» состоится 31 июля 2017 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 27 июля 2017.

**Повестка дня собрания:**

1. О выплате дивидендов за 1 полугодие 2017 года.

Собрание будет проводиться в очной форме.

Голосование на собрании будет осуществляться бюллетенями для голосования.

Документы, подлежащие представлению лицам, имеющим право на участие в собрании акционеров:

Проект решения по вопросу повестки дня собрания.

Лицам, имеющим право на участие собрании, можно ознакомиться с документами с 27 июля 2017 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33.

**Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 31 июля 2017 года с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

УНП 700049607

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

19 ліпеня 2017 г.
№26 (410)




стар. 3

Каб храмы не гарэлі



стар. 5

Знайсці працу ў маленькім горадзе



стар. 8

Куды бягуць малочныя ручаі?

ТЭМА ТЫДНЯ

# На дзесяць вакансій — шэсць прэтэндэнтаў




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**НАКОЛЬКІ складана сёння знайсці работу? Якіх спецыялістаў не хапае наймальнікам? Ці не ствараюцца новыя працоўныя месцы проста «для галачкі»? І калі, нарэшце, павысіцца дапамога па беспрацоўі? У гэтым артыкуле мы пастараліся адказаць на самыя актуальныя пытанні аб занятасці.**

## Напружанасць зніжаецца

У параўнанні з мінулым годам намеціліся пазітыўныя тэндэнцыі.

— Больш за ўсё нас абнадзейвае тое, што расце попыт на працоўную сілу і адпаведна зніжаецца напружанасць на рынку. Калі летась наймальнікі заяўлялі ў сярэднім 34 тысячы вакансій у месяц, то сёння гэта ўжо 50 тысяч. Год таму на адно свабоднае месца прэтэндавала 1,3 беспрацоўнага, цяпер жа — 0,6, — адзначае **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.**

стар. 4

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

# УВЕКАВЕЧЫЛІ ІМЁНЫ ЎСІХ

## Стараста вёскі Сітніцкі Двор ініцыявала стварэнне новага помніка на месцы расстрэлу ў 1942 годзе 480 жыхароў

**Вёску Сітніцкі Двор спалілі 12 лістапада 1942 года, а ўсіх яе жыхароў расстралялі і закапалі ў агульнай яме на ўзлеску. У траншэю скідвалі нават тых, хто яшчэ падаваў прыкметы жыцця. Потым некалькі дзён зямля варушылася, расказвалі людзі, якія аплаквалі сваіх сваякоў. Гэтыя страшныя ўспаміны перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Уратавацца ўдалося толькі дваім — 12-гадовай Антаніне і малому хлопчыку Грышы, якога маці сумела адштурхнуць у бок поля, калі іх вялі на расстрэл. Цяпер Антаніне Анісімавай 87 гадоў, Рыгор Клімовіч некалькі гадоў таму пайшоў з жыцця.**

...Сітніцкі Двор — з тых спаленых вёсак, якія адрадзіліся пасля вайны. Цяпер тут налічваецца крыху больш за сотню жыхароў. Старастам людзі абралі аўтарытэтнага чалавека — былога дырэктара школы Галіну Крывулец. Галіна Рыгораўна прыйшла два гады таму да старшыні Сінкевіцкага сельскага Савета Валерыя Краснікевіча з прапановай пабудаваць новы помнік на месцы расстрэлу. Недзе ў 1960-х гадах там быў узведзены тыповы для той пары бетонны манумент, на якім змясцілася некалькі лаканічных радкоў з датай трагедыі і лікам ахвяр. Пазней побач устанавілі яшчэ адзін помнік-камень. На ім па-польску былі пазначаны імёны вяскоўцаў-католікаў. Памятны знак зрабілі польскія сваякі загінулых недзе на пачатку 1980-х.

— Але ж людзі справядліва палічылі, што трэба ўвекавечыць імёны ўсіх, — даводзіла стараста. — Там ляжаць жыхары вёскі ўсіх пакаленняў, у тым ліку падлеткі, малыя дзеці і зусім немаўляты — тыя, чые ненароджаныя нашчадкі не могуць аддаць даніну памяці.

Старшыня ідэю падтрымаў адразу. Тады ж у сельсавеце намалявалі эскіз помніка, вырашылі, што гэта будзе крыж на фоне адкрытых старонак, на якіх трэба ўмясціць прозвішчы ўсіх 480 вяскоўцаў. Аб'явілі збор грошай. Валерый Краснікевіч кажа, што за даволі кароткі час удалося сабраць пяць мільёнаў недзэнамінаваных рублёў. Да работы падключыўся выхадзец з гэтай вёскі, дэпутат Мікашэвіцкага гарадскога Савета дэпутатаў Сямён Ляўковіч.

стар. 3



Новы помнік расстраляным аднавяскоўцам.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## ЯКАСЦЬ ВЫТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКАГА МЯСА — НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

Такую ацэнку даў міністр Галоўнага дзяржаўнага ўпраўлення па кантролі якасці, інспекцыі і каранціне Кітайскай Народнай Рэспублікі Чжы Шупін




На мінулым тыдні прайшла сустрэча члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, генеральнага дырэктара ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» Васіля Маркевіча з членамі кітайскай дэлегацыі Галоўнага дзяржаўнага ўпраўлення па кантролі якасці, інспекцыі і каранціне Кітайскай Народнай Рэспублікі на чале з міністрам Чжы Шупінам. Бакі абмеркавалі перспектывы беларуска-кітайскіх адносін у галіне экспарту прадуктаў харчавання з Рэспублікі Беларусь у Кітай.

— З дэлегацыяй мы абгаварылі пастаўку прадукцыі ў Кітай і спадзяёмся, што ў выніку гэтая ідэя будзе рэалізаваная, — адзначыў Васіль Маркевіч. — Сам візіт можна назваць азнаямленчым, бо кітайскай дэлегацыі трэба было пераглядзець на наша прадпрыемства — і для іх арганізавалі прэзентацыю. Мы шукаем рынкі, выходзім на новыя дзяржавы, паколькі ўжо забяспечылі сваю краіну гэтай прадукцыяй.

## ПЫТАННІ ЖКГ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

У Савеце Рэспублікі адбылася нарада па падрыхтоўцы пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі па пытаннях работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі

Сустрэча адбылася пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова. У нарадзе прынялі ўдзел міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр Церахаў, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Аляксей Васільеў, першы намеснік міністра энергетыкі Віктар Каранкевіч, першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія Малкіна, намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Наталля Жукава і іншыя.

Спектр задач, якія былі разгледжаны ўдзельнікамі, надзвычай шырокі. Акрамя падрыхтоўкі будучага мерапрыемства было вызначана кола пытанняў для вывучэння, якія датычацца ўдасканалення прававых, арганізацыйных і эканамічных асноў развіцця і дзейнасці жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

## ПРАЦУЕМ У РЭГІЁНАХ

Член Прэзідыума Савета Рэспублікі Сяргей Рахманаў правёў выязное пасяджэнне ў Віцебскай вобласці

На базе ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблгаз» удзельнікі абмеркавалі вынікі пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы і чацвёртага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Акрамя таго, былі разгледжаны пытанні эканамічнай і нацыянальнай бяспекі нашай краіны, аспекты развіцця ўзаемаадносін з Расійскай Федэрацыяй, міжнароднай і міжпарламенцкай дзейнасці, а таксама прыярытэтныя кірункі далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы.

У рамках выязнога пасяджэння Сяргей Рахманаў правёў асабісты прыём грамадзян і прамую тэлефонную лінію. Таксама ўдзельнікі выязнога пасяджэння азнаёміліся з навукова-практычнай дзейнасцю Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, работай сельскагаспадарчай вытворчасці «Віцебскаблгаз» — «Мазолавагаз» і дзейнасцю вытворчага аб'яднання «Энергакамплект».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** lukashevich@zviazda.by

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

# НЕ ПРЫМУСІЦЬ, А ДАМОВІЦЦА?

**«У нашу вёску толькі два разы на тыдзень ходзіць рэйсавы аўтобус. Кіроўцы маршрутак адмаўляюцца сюды заязджаць з-за дрэннай дарогі. Мы неаднаразова прасілі, каб участак у нейкіх 13—14 кіламетраў заасфальтавалі, але нам усюды адмаўляюць. У нас закрылі стацыянарную краму, замест яе пусцілі аўталаўку. Дапамажыце вырашыць праблемы», — звярнуліся ў рэдакцыю жыхары вёскі Лугавая Капыльскага раёна.**



З пытаннем наконт крамы адразу звяртаюся да **выконваючай абавязкі намесніка старшыні па гандлі райспажыўсаюза Наталлі КАНОНЧЫК.**

— У Лугавой афіцыйна пражываюць 57 чалавек, палова з іх — пенсіянеры. Сапраўды, яшчэ нядаўна тут працавала крама, але яе закрылі па аб'ектыўных прычынах. Па-першае, яна была стратная, прадукты не раскупляліся. Па-другое, будынак патрабуе капітальнага рамонту. А ўкладваць у яго грошы бессэнсоўна. Цяпер у вёску ходзіць аўталаўка тры разы на тыдзень. У нас зацверджаны пералік тавараў, якія пастаянна ў продажы. Тыя, што не прадугледжаны асартыментам, завозім па папярэдніх заказах пакупнікоў. Малочную прадукцыю бяром у Слуцкім філіяле Салігорскага камбіната. Вялікім попытам карыстаюцца малочныя і мясныя вырабы агракамбіната «Сноў», — расказала Наталля Максімаўна. — Прадукты завозім заўсёды самыя свежыя, паколькі бяруцца яны не ў крамах, а на складзе. Заадно па заказах жыхароў дастаўляем і буйнагабарытныя грузы: тэлевізары, пральныя машыны, іншыя спадарожныя тавары.

Адна справа выслухаць спецыяліста, і зусім іншая — пабачыць усё на свае вочы. Разам з вядучым інжынерам па тэхніцы бяспекі мясцовага ДРБУ Андрэем Леусам едзем у Лугавую. Машына збочвае з асфальтаванай шашы: адсюль да вёскі тыя самыя 13 кіламетраў. Дарога роўная, без выбоін. У народзе такую называюць гасцінцам, трактам. «Тут можна ехаць і 90 кіламетраў у гадзіну», — канстатуе кіроўца і прыбаўляе хуткасць.

— Апошні раз гэты адрэзак грэйдзіравалі 29 чэрвеня, а перад гэтым — 5 мая, — кажа Андрэй Мікалаевіч. — Пракласці тут асфальт нерэальна — спатрэбіцца 300 млн рублёў. Гэта, можна сказаць, гадавы бюджэт раёна.

Вёска сустрэла нас цішынёй: на вуліцы ніводнага чалавека. Каля аднаго з дамоў у агародзе заўважаем жанчыну і хлопца.

— Мы дачнікі, прыязджаем сюды на выхадныя, — кажа гаспадыня. Пад лістом я не ставіла подпіс, бо ніхто з мясцовых не звяртаўся. Але ў вёску сапраўды дабрацца з Мінска праблематычна.

На другім падворку каля весніц прыкмецілі яшчэ адну жанчыну, якая прадставілася Ліліяй Ашарчук:

— Мы шмат чым незадаволены. Маршруткі мінаюць нашу вёску, кіроўцы не хочуць сюды збочваць, бо няма асфальту. Няма прамых транспартных зносін з Мінскам, суседняй Уздой. Дабрацца да сталіцы можна з Пясочнага або Слабады-Кучынкі, але туды трэба ісці пешшу сем кіламетраў.

Падтрымлівае зямлячку і Галіна Ярашэвіч:

— Каб даехаць да Узды, трэба ісці лесам тры кіламетры ў вёску Віркова, а там ужо садзіцца на аўтобус... Адтуль зручней патрапіць і да Мінска: часцей ходзяць маршрутныя таксі. Да таго жва Уздзе вялікая крама, адпаведна і большы выбар прадуктаў. Ды і рынак лепшы.

Пачуўшы, што ў Лугавую прыехала нейкая дэлегацыя, падцягваюцца і іншыя жыхары:

— Кажуць, што па дакументах на дарозе ляжыць асфальт, два ці тры разы выдзяляліся на яго грошы з бюджэту.

— Ніколі яго там не было і не планавалася. Працую на прадпрыемстве 21 год і магу з упэўненасцю гэта сказаць! Не думайце, што такі факт лёгка схаваць. Гэта галаслоўнае сцвярджанне, — аўтарытэтна заяўляе вядучы інжынер.

— А можна па аналогіі спытаць: чаму ў вас драўляныя хаты, а не каменныя палацы.

— Дык вы дарогу прагрэйдзіравалі толькі пасля таго, як мы напісалі скаргу, — лічаць мясцовыя жыхары.

— Няпраўда, дарога пастаянна ўладкоўваецца, — сцвярджае Андрэй Леус. — Апошні раз грэйдар прайшоў 29 чэрвеня. Магу гэта даказаць. У нас на кожнай адзінцы тэхнікі стаіць навігатар. Калі трактарыст не захоча ехаць, схалтурыць, я ўключу камп'ютар і ўбачу, дзе ён быў, што рабіў і колькі разоў прайшоўся па гэтай дарозе. Гэта ўсё пад жорсткім кантролем.

Але зноў і зноў размова круцілася вакол дарогі. Маўляў, чаму ў Пясочным на кожнай вуліцы асфальт ляжыць? А мы, што, горшыя?

Пясочнае з'яўляецца аграгарадком, таму ў свой час фінансаванне інфраструктуры адбывалася за кошт дзяржаўнай праграмы, растлумачылі ім.

Паступова размова павярнулася да транспартных зносін: «Пусціце хоць маршрутку да Узды! Нам Капыль не трэба, туды ніхто не ездзіць».

Але мясцовыя ўлады не могуць прымусіць прыватнікаў збочваць у Лугавую — хіба што толькі дамовіцца. Так што пытанне па-ранейшаму застаецца адкрытым і яго трэба вырашаць — так ці інакш. Або тлумачыць людзям сваю пазіцыю. Для гэтага і існуе мясцовая ўлада.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
lazovskaya@zviazda.by

ДЗЕЛАВЫЯ ЛЮДЗІ

# Магчымасць працаваць на сябе

**Напачатку — цытата легендарнага палітыка Уінстана Чэрчыля. «Адны бачаць у ім ваўка, якога трэба забіць. Іншыя — карову, якую можна бясконца даіць. І мала хто бачыць у ім таго, хто ён на самай справе. Ён — конь, які цягне воз!» Так вобразна прэм'ер Вялікабрытаніі выказаўся пра... прадпрымальніка. Гэта выказванне актуальнае і сёння.**

У Віцебску працуюць больш за 3,2 тысячы прыватных прадпрыемстваў і каля 7,8 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў. Доля падаткаў, якія паступілі ў бюджэт «ад бізнесу» ў першым квартале года, склала больш за 20 працэнтаў.

— А летась гэты паказчык быў на ўзроўні 16%. Сёння гандлем займаюцца толькі 30%, 20% аказваюць паслугі, за вытворчасцю — 12% бізнесу, за транспартнымі перавозкамі — 8%, будаўніцтвам — 6,5%. Зразумела, задача мясцовай улады стымуляваць інтарэс да ўласнай справы, звязанай з вытворчасцю, — расказвае **намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Зінаіда КАРАЛЁВА.**

Цікава, што з усіх працаздольных гараджан прыкладна трэць — гэта каля 47 тысяч чалавек — заняты ў сектары малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

Пры гарвыканкаме функцыянуе Савет па развіцці прадпрымальніцтва, створаны ў кастрычніку 2003 года. Сярод яго членаў — кіраўнікі прыватных прадпрыемстваў, начальнікі ўпраўленняў і аддзелаў гарвыканкама, нават прадстаўнікі падатковай інспекцыі. Штомесяц праводзяцца пасяджэнні, падчас якіх можна агучыць праблемныя пытанні. (На чарговым, дарэчы, дзелавыя людзі выказалі прэтэнзіі да журналістаў: «Чаму мясцовыя газеты мала пішуць або наогул ігнаруюць тэму бізнесу? А калі расказваюць пра парушэнні, якія выявілі праваахоўныя органы, то не даюць магчымасці выказаць сваю пазіцыю другому боку?»)

Увогуле ж члены савета заўважылі, што грамадзяне не вельмі імкнуцца ў прадпрымальнікі. Хоць накват замежныя эксперты адзначаюць, што ўмовы для бізнесу ў нашай краіне значна палепшыліся ў апошнія гады. Таму трэба актыўна прапагандаваць магчымасць працаваць на сябе.

А нядаўна дзелавыя людзі сустрэліся з парламентарыямі, якія прадстаўляюць Віцебшчыну. Адбыўся канструктыўны дыялог. Сенатары і дэпутаты выслухалі прапановы, якія змогуць паспрыяць развіццю прыватнай ініцыятывы...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
pukshanski@zviazda.by

# УВЕКАВЕЧЫЛІ ІМЁНЫ ЎСІХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Збор яшчэ працягваўся, калі прадпрымальнік Аляксандр Круковіч, у якога заказалі выраб помніка, аб'явіў, што грошай не возьме, а лічыць гэта сваім укладам у справу ўвекавечання памяці. На сельскім сходзе прадпрымальніку падзякавалі, а грошы вырашылі перанакіраваць на добраўпарадкаванне магілак. Помнік вырабілі даволі хутка. На гранітных старонках манумента на беларускай мове пералічаны ўсе нявінна забітыя жыхары вёскі і зямляны звесткі пра факт знішчэння Сітніцкага Двара разам з жыхарамі.

Новы манумент урачыста адкрылі 9 мая 2016 года. На мерапрыемства сабраліся сотні людзей. Прыехалі сваякі цяперашніх вяскоўцаў і тых людзей, хто знайшоў спакой пад плітамі мемарыялаў.

Такім чынам, на месцы расстрэлу 75-гадовай даўніны цяпер утварыўся своеасаблівы комплекс з розных памятных знакаў. Паднеўся малады лес, высокія стройныя сосны цягнуцца да сонца. На ўсе лады пяюць птушкі, вакол — цэлае мора кветак. Такія прыгожыя мясціны ў іншай сітуацыі маглі б быць ідэальным месцам для адпачынку, а сталі могілкамі з адной магілай для ўсёй вёскі. Парадак тут падтрымлівае староста, ёй дапамагаюць школьнікі і актывісты.

На адкрыцці помніка была і Антаніна Анісімава. У яе тут ляжаць маці, бацька, брат з жонкай і дзецьмі. Антаніна Філіпаўна ўспамінае, што немцы не з першага разу спалілі вёску і забілі яе жыхароў. Першы раз яны наляцелі пасля адной партызанскай дыверсіі — падрыву моста. Але партызанскі атрад сумеў даць адпор. Карнікаў затрымалі, людзі тым часам змаглі збегчы ў лес. Уцякала з усімі тады і 12-гадовая Тоня. У адной хаце засталася на ложку паралізаваная жанчына. Дык немцы яе вынеслі, пасадзілі на накрыўку калодзежа, застрэлілі, а труп скінулі ў калодзеж. Калі на пахаванне няшчаснай сабраліся Тоніны сваякі, бабуля і забрала дзяўчынку да сябе ў суседнюю вёску — як адчувала, што адным налётам не скончыцца. Потым яна пераправіла Тоню да замужняй сястры Алены ў Сінкевічы. Дзяўчынкі не было дома 12 лістапада, таму і засталася жыць.

— Як гаравалі пасля вайны, вам і не расказаць, — згадвае Антаніна Філіпаўна. — Галодная была часта. Як хто дасць місачку проса, за шчасце было. У сястры яшчэ ў вайну захварэў муж, памёр на наступны дзень пасля вызвалення. Яна засталася з двума малымі. А тут яшчэ я. Дапамагала па гаспадарцы, чым магла. Потым мяне нават аддавалі ў «заработкі» — даглядаць малое дзіця. Працавала ў полі з ранніх гадоў. Ды што тут гаварыць... Нават калі выйшла замуж, некаторы час з маладым мужам жылі ў зямлянцы. Потым нам калгас лесу выдзеліў. Выгадавалі чатырох дзяцей, цяпер у мяне восем унукаў, восем праўнукаў. Часам думаю: цяжкае жыццё было, але Бог даў мне доўгі век, значыць, я павінна жыць за іх, сваіх родных, суседзяў, тых, каго расстралялі...

— Дарэчы, Грыша (Клімовіч. — **Аўт.**) усё жыццё жыў у Расіі. Паехаў туды да сваякоў, дзеці там жывуць, унукі, — успомніла Антаніна Анісімава. — Але часта прыязджаў: цягнула яго ў родныя мясціны. Я ўжо яго сустракала як роднага. Мы ж з ім удваіх засталіся. Дык вось у адзін з прыездаў і памёр тут, у роднай вёсцы, не вытрымала сэрца...



Антаніна АНІСІМАВА.

У сваёй хаце бабуля Антаніна цяпер пражывае адна. Найбліжэйшая дачка — у Сінкевічах, часта наведвае матулю. Адзін сын жыве пад Мінскам, другі ў Брэсце. Тыя, вядома, выбіраюцца радзей. Бабуліна гаспадарка — гэта некалькі курачак, сабака ды кошка з кацянятамі. Калі лепей сябе адчувае, яшчэ і ў краму самастойна дабярэцца. А вось зайсці да помніка, каб пакланіцца родным, ёй самастойна ўжо не пад сілу: чакае, калі дзеці завязуць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

*Лунінецкі раён.*

ПРАФІЛАКТЫКА

# КАБ ХРАМЫ НЕ ГАРЭЛІ...

**У Гродзенскай вобласці ўзмацняюць меры бяспекі культавых устаноў, але свечкі ў храмах запальваць можна**

**З 2003 года тут адбылося 12 пажараў. Страты склалі больш за 20 тыс. рублёў, не абышлося і без ахвяр. У агні загінуў вартаўнік аднаго з храмаў. Літаральна ў чэрвені дашчэнту згарэў драўляны касцёл у вёсцы Клюшчаны Астравецкага раёна, які быў пабудаваны 300 гадоў таму.**

## АГОРНУТЫ ПОЛЫМЕМ

У вобласці не памятаюць другі такі выпадак. Старажытны касцёл Святога Яўхіма быў знішчаны агнём за лічаныя хвіліны. Якія страты і хто вінаваты — разбіраюцца следчыя органы. Але найбольш магчымай прычынай здарэння называюць парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і абсталявання. Устаноўлена, што электрычная праводка знаходзілася ў аварыйным стане.

Тры ма гадамі раней аналагічная прычына пажару ўстаноўлена ў праваслаўным храме Свяціцеля Мікалая Цудатворцы ў пасёлку Юрацішкі Іўеўскага раёна. Праўда, вынік не быў такі жудасны, як у Клюшчанах. Агонь пашкодзіў храм часткова — дах, сцяну і маёмасць вакол алтара. Тым не менш страты склалі амаль 3,5 тыс. рублёў.

Небяспечная праводка прывяла да ўзгарання касцела Архангела Міхаіла ў весцы Скрундзі Дзятлаўскага раёна. У выніку страты — амаль 2 тыс. рублёў.

Не абышлі пажары і гродзенскія храмы. Больш за шэсць гадоў вялося ўзнаўленне Фарнага касцёла XVII стагоддзя, драўляны алтар якога поўнасцю выгарэў, у тым ліку пацярпелі рэльефныя калоны, дэкор і чатыры ўнікальныя скульптуры. Пажар узнік ад кароткага замыкання праводкі. Старажытная харальная сінагога таксама не пазбегла ўзгарання. Тры гады таму тут узнік пажар з-за парушэння правілаў эксплуатацыі сістэмы ацяплення. У выніку пашкоджана перакрыццё паміж паверхамі. Гродзенская сінагога — адна з найстарэйшых у Еўропе і занесена ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Дарэчы, сінагога пабудавана на рэштках храма XVI стагоддзя, які згарэў у 1900 годзе.



Падчас круглага стала.

> Мясцовыя ўлады і ратавальнікі пастаянна трымаюць на кантролі пажарна-тэхнічны стан храмаў. Але апошні выпадак з касцёлам, які поўнасцю згарэў, прымусіў больш пільна паглядзець на гэту праблему.

## У ЗОНЕ РЫЗЫКІ

Мясцовыя ўлады і ратавальнікі пастаянна трымаюць на кантролі пажарна-тэхнічны стан храмаў. Але апошні выпадак з касцёлам, які поўнасцю згарэў, прымусіў больш пільна паглядзець на гэту праблему. У адпаведнасці з даручэннем старшыні Гродзенскага аблвыканкама была праведзена татальная праверка ўсіх культавых устаноў рэгіёна. У чэрвені даследавалі 520 храмаў розных канфесій — цэркваў, касцёлаў, мячэцi, сінагогу і іншыя. Аказалася, што многія аб'екты царкоўнага дойлідства знаходзяцца ў зоне рызыкі.

— Мы выявілі шмат недахопаў, — зазначае **начальнік аддзела нагляду і прафілактыкі Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Андрэй МІХАЛЬЧАНКА.** — На 280 аб'ектах адсутнічае альбо няспраўная сістэма аўтаматычнай пажарнай сігналізацыі. На многіх няма нават вогнетушыцеля, разам з тым эксплуатуецца абсталяванне, якое знаходзіцца ў аварыйным стане. І гэта не адзін-два аб'екты, а больш за сотню.

Таксама ратавальнікі звярнулі ўвагу на прылады, якія абараняюць ад удару маланкі. Як аказалася, многія храмы пазбаўлены такога важнага сродку супрацьпажарнай бяспекі, хоць узгаранні па гэтай прычыне таксама зафіксаваны.

З названымі праблемамі азнаёмлены прадстаўнікі рэлігійных аб'яднанняў падчас круглага стала, арганізаванага Гродзенскім аблвыканкамам і абласным упраўленнем МНС. Святарам рэкамендавана ў самы бліжэйшы час ліквідаваць недахопы ў сваіх прыходах — у першую чаргу ўстанавіць аўтаматычную пажарную сігналізацыю.

## УСЁЙ ГРАМАДОЙ

Калі зазірнуць у гісторыю храмаў, можна даведацца, што многія з іх неадназова ўзводзіліся на месцы былых папялішчаў. Менавіта так на пачатку мінулага стагоддзя адбылося і з царквой Казанскай Божай Маці, што ў аграгарадку Парэчча Гродзенскага раёна. Папярэдні храм згарэў у сярэдзіне XIX стагоддзя. Пасля таго як сабралі грошы, пачалі будаваць новую драўляную царкву. Адбылося гэта больш за сто гадоў таму. Цяпер царква і каталіцкі касцёл з'яўляюцца самымі старажытнымі будынкамі аграгарадка і ўваходзяць у спіс гісторыка-культурнай спадчыны. Праўда, царква патрабуе рамонту, і гэтыя работы вядуцца не адзін год. Але ў найбліжэйшы час вырашана збор сродкаў накіраваць на супрацьпажарную бяспеку.

— Зараз будзем усталёўваць грамаадвод, у нас ужо ёсць вогнетушыцель і сістэма пажарнай сігналізацыі, — кажа настаяцель Аляксандр Іваноў.

Але многія прыходы невялікія і забяспечыць самастойна ўстаноўку аўтаматычнай сігналізацыі яны не ў стане.

— Наша епархія будзе дапамагаць такім прыходам, — паведаміў **намеснік канцлера Гродзенскай каталіцкай епархіі Антоній ГРЭМЗА.** — Сродкі будзем збіраць мэтанакіравана, у кожным прыходзе.

> Святарам рэкамендавана ў самы бліжэйшы час ліквідаваць недахопы ў сваіх прыходах — у першую чаргу ўстанавіць аўтаматычную пажарную сігналізацыю.



Касцёл згарэў дашчэнту.

Ужо вырашана, што да канца ліпеня ў большасці храмаў адрамантуюць электраправодку, забяспечаць наяўнасць вогнетушыцеляў, а таксама заключаць дагаворы на тэхнічнае абслугоўванне сістэм пажарнай сігналізацыі.

Меры бяспекі актуальныя для касцёлаў і цэркваў, бо да іх ёсць доступ «жывому» агню. Цяпер свечкі запальваюць толькі пад наглядам альбо падчас службы, а не так, як раней, калі храмы наведвалі групы турыстаў ці паломнікаў. Праўда, святары папярэджваюць, што ў невялікіх храмах пажарная сігналізацыя спрацоўвае нават і тады, калі ідзе служба. Гэта можа адбыцца як ад запаленых свечак, так і ад каджэння (размахванні кадзілам). Але адмаўляцца ад традыцыйнага абраду, які рыхтуе прыхаджан да малітвы, ніхто са святароў не збіраецца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

**Аляксандр ВЯРСОЦКІ, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама:**

— Літаральна за некалькі тыдняў была праведзена рэвізія пажарнай бяспекі культавых аб'ектаў. Яна паказала, што многія пытанні трэба вырашаць неадкладна, каб не дапусціць паўтарэння надзвычайнай сітуацыі, якая адбылася з касцёлам у вёсцы Клюшчаны.

Гэта павінна хваляваць не толькі ўлады, бо сітуацыя датычыцца бяспекі і святароў, і ўсіх прыхаджан, якія наведваюць храмы. Гэта яшчэ і работа па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, бо пераважная большасць культавых будынкаў адносіцца менавіта да гэтай катэгорыі.

МЕРКАВАННІ

## Чаму пры наяўнасці ў Беларусі 50 тысяч вакансій не ўсім удаецца знайсці працу?

***З такім пытаннем мы звярнуліся да тых, хто мае прамое дачыненне да гэтай праблемы.***

**Старшыня Дзяржынскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр САРАКАЧ:**

— Перш за ўсё, праца павінна быць даспадобы — гэта значыць менавіта той кірунак і тая кваліфікацыя, па якой чалавек хацеў бы сябе рэалізаваць. Вядома, вострa стаіць пытанне зарплаты. Што да маладых людзей, то яны адразу жадаюць прыйсці і быць вялікімі кіраўнікамі з вялікімі заробкамі — але так не бывае. Калі чалавек праходзіць усе прафесійныя прыступкі, тады ён ведае цану сваёй пасадзе і кожнаму заробленаму рублю. Што датычыцца дарослых людзей, то я думаю, што тая ж самая праблема і ў іх — гэта амбіцыі. Так, у многіх ёсць вышэйшая адукацыя, ёсць жаданне быць кіраўніком, хоць працоўны стаж невялікі, а рабочая гісторыя — у суцэльных перабежках на розныя месцы... Што да Дзяржынскага раёна, вакансіі ў нас ёсць — мы ўсяляк дапамагаем людзям і працаўладкоўваем іх. Вядома, уплывае блізкасць Мінска — многія жыхары Дзяржынска і Фаніпаля шукаюць працу і працуюць у сталіцы.

**Намеснік дырэктара Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Інфармацыйна-вылічальны цэнтр Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь» Уладзімір ДОЎНАР:**

— Усё проста на самай справе. Дзе больш за ўсё вакансій? У Мінску. А дзе больш за ўсё беспрацоўных? У раёнах. Большасць розных прадпрыемстваў зарэгістравана менавіта ў Мінску — калі браць статыстыку. Але калі чалавек жыве ў Маладзечне або Вілейцы, то кожны дзень ездзіць на працу ў сталіцу цяжка. Яшчэ адна прычына заключаецца ў наступным: у 1990-я і 2000-я гады бацькі адпраўлялі сваіх дзяцей на такія папулярныя спецыяльнасці, як эканамісты і юрысты. І фактычна сёння страчаны такі пласт, як простыя работнікі. У нас атрымаўся вялікі прабел — вакансіі ёсць, а спецыялістаў у гэтай галіне няма. Акрамя таго, яшчэ адна прычына — гэта зарплата і прэстыж. Калі не задавальнае фінансавае напаўненне, то чалавек пачынае шукаць нейкія варыянты — можа дапамагчы нешта перанесці, перавезці, дзе-небудзь што-небудзь зрабіць і г. д. Іншымі словамі, ніякіх дагавораў не заключаецца, усё гэта грунтуецца на асабістых пагадненнях. Да таго ж прадпрыемству таксама добра — падаткі ж не плацяцца! Але ў нас з гэтым актыўна змагаюцца розныя службы...

**Старшыня Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў Наталля СУШКО:**

— Усё залежыць ад жадання чалавека. Калі чалавек настроены працаваць, калі ён хоча прыкласці свой розум і здольнасці, то з улікам наяўных вакансій такая магчымасць ёсць. Проста шмат хто адмаўляецца ад гэтага, людзі чакаюць лепшай прапановы. Калі я працавала ў камісіі па працаўладкаванні, то былі грамадзяне, якія па некалькі разоў прыходзілі: мы ім прапаноўвалі вакансіі, але яны адмаўляліся. Чаму? Іх не задавальняла, што трэба кудысьці ехаць, не задавальняла зарплата, яшчэ нейкія моманты. Але ж калі чалавек сапраўды хоча, то ён дасць згоду. Іншыя ўладкоўваліся, але праз некаторы час звальняліся. Напрыклад, тыя, хто вядзе асацыяльны лад жыцця, злоўжывае. Гэта значыць ніякая праца іх не спыніць. Як работадаўца можа з імі супрацоўнічаць, калі яны не выконваюць патрабаванні па бяспецы і ахове працы, прыходзяць у стане алкагольнага ап'янення? Вядома, часам бываюць сітуацыі, калі прыдатнай вакансіі няма. Але ж і тады можна працаўладкавацца — перавучыцца, асвоіць іншую спецыяльнасць. Я ўпэўнена, што на першым месцы — адназначна жаданне.

**Начальнік аддзела рынку працы і распрацоўкі праграм занятасці ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама Марына БЕЛАБАРОДЗЬКА:**

— Уся справа ў неадпаведным балансе вакансій. Праблема заключаецца ў тым, што попыт на працоўныя месцы не адпавядае прапанаваным вакансіям. Растлумачу: сёння каля адной трэці беспрацоўных — гэта людзі, якія не маюць кваліфікацыі, прасцей кажучы, яны нічога не ўмеюць альбо страцілі свае здольнасці з-за доўгага прастою. А большасць пазіцый, якія прапануюцца беспрацоўным, звязаныя з пэўнымі ўменнямі, — гэта значыць чалавек павінен быць адукаваны. Таму атрымліваецца такая сітуацыя, што ёсць вакансіі для інжынераў, у сферы аховы здароўя, аднак беспрацоўныя папросту не здольныя гэтым займацца з-за недахопу ўменняў. Што рабіць у такой сітуацыі? Мы ўжо вырашаем гэтае пытанне: сёння праводзіцца навучанне беспрацоўных па пэўных спецыяльнасцях, таму пры жаданні можна атрымаць новую прафесію і знайсці працу.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# На дзесяць вакансій — шэсць прэтэндэнтаў

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Скарачаецца і сярэдні перыяд пошуку работы. Разам з гэтым у службу занятасці стала звяртацца больш людзей па садзейнічанне. На працягу пяці месяцаў гэтага года з яе дапамогай было працаўладкавана 66,6 тысячы чалавек, у той час як за аналагічны перыяд мінулага года — 54 тысячы. Адзначаецца больш актыўная пазіцыя грамадзян у пытаннях перанавучання. За студзень — чэрвень новую прафесію атрымалі 5,3 тысячы чалавек (леташні паказчык за такі ж час на чвэрць меншы).

***— Чаму, нягледзячы на рост вакансій, у службы занятасці сталі звяртацца часцей?***

— Пасля даручэння Прэзідэнта працаўладкаваць усіх, хто хоча, якое было дадзена ў сакавіку, актывізаваліся органы ўлады на месцах. Людзі паверылі, што ім могуць дапамагчы. І тыя, хто раней не звяртаўся і шукаў работу сам, вырашылі прыйсці да нас. Гэта добра, — лічыць прадстаўнік міністэрства.

Спецыялісты органаў працаўладкавання сталі больш цесна супрацоўнічаць з наймальнікамі. У адпаведнасці з новым Законам аб занятасці кожнае прадпрыемства абавязана паведаміць у службу занятасці пра вакансію на працягу пяці дзён з моманту яе з'яўлення. Гэта прыносіць карысць і наймальніку (ён хутчэй знойдзе работніка), і дзяржаўным службам: яны эфектыўней змогуць працаўладкаваць грамадзян, якія звярнуліся да іх.

## Праблемны раён — Маладзечанскі

Узровень беспрацоўя сёння складае 0,8 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва. У большасці раёнаў ён не перавышае 1,5 працэнта, сітуацыя з работай у асноўным выраўнялася. Толькі ў адным раёне краіны, Маладзечанскім, гэты паказчык складае 1,9 працэнта. Такая праблема была ў Маладзечне і летась, і пазалетась.

— У свой час гэта быў сур'ёзны прамысловы раён, але за апошнія гады частку прадпрыемстваў ліквідавалі, частка скараціла персанал выходзячы з эканамічнай мэтазгоднасці, — кажа Алег Токун. — І, на жаль, пакуль там не ствараецца дастатковая колькасць працоўных месцаў, якая б пакрыла ўсе патрэбы.

З пачатку года змяншаецца вымушаная няпоўная занятасць і колькасць дзённых і зменных прастояў па віне наймальніка. У студзені — маі ў такім рэжыме працавала амаль 112 тысяч чалавек — гэта 3,7 працэнта ад спісачнай колькасці работнікаў (у асноўным у прамысловасці і будаўніцтве). У параўнанні з папярэднім годам паказчык знізіўся амаль у два разы: у студзені — маі 2016-га на няпоўнай занятасці знаходзілася 209 тысяч беларусаў, ці 6,8 працэнта ад усіх работнікаў. Заўважана і штомесячнае змяншэнне колькасці людзей, якія знаходзяцца ў вымушаных водпусках.

## Патрэба ў медперсанале — пяць тысяч работнікаў

Якія спецыялісты цяпер запатрабаваны? Трэба сказаць, апошнія гады попыт асабліва не змяняецца. Неабходны ўрачы, сярэдні медыцынскі персанал: у краіне не хапае 2,5 тысячы дактароў і тры тысячы медсясцёр. Шмат прапаноў для кіроўцаў аўтамабіляў, прадаўцоў, прыбіральшчыкаў памяшканняў. 56 працэнтаў усіх вакансій — па рабочых прафесіях. Калі кажам пра сельскую мясцовасць, то там традыцыйна



Фота Надзеі БУЖАН.

запатрабаваны заатэхнікі, ветэрынары, жывёлаводы, трактарысты.

Па абласцях попыт крыху адрозніваецца. На Гомельшчыне і ў Мінску больш за ўсё прапаноў для медыцынскіх сясцёр. У топ-5 запатрабаваных сталічных прафесій і пасад увайшлі таксама кухар і дырэктар. У Мінскай вобласці на першым месцы па неабходнасці кіроўцы, у Віцебскай, Магілёўскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях — урачы. На Гомельшчыне і Віцебшчыне, акрамя гэтага, адчуваецца недахоп аператараў машыннага даення.

### ЛІЧБЫ РЫНКУ ПРАЦЫ

⇨ **Два месяцы** ў сярэднім ідзе ў беларусаў на пошук работы. Хутчэй за ўсіх новае месца знаходзіць моладзь — за 1,6 месяца.

⇨ **29 працэнтаў** з ліку беспрацоўных — тыя, хто не працуе доўгі час.

⇨ **13 працэнтаў** беспрацоўных маюць дыплом універсітэта. Пераважная ж колькасць тых, хто не мае працы, — з агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.

Па прагнозах урада, у наступныя гады на беларускім рынку працы будзе адбывацца пераразмеркаванне працоўнай сілы паміж галінамі. Чакаецца, што колькасць работнікаў скароціцца ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. У дзяржпраграме аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва да 2020 года тлумачыцца, што гэта ў многім абумоўлена мадэрнізацыяй вытворчасці, укараненнем рэсурсазберагальных тэхналогій, ростам вытворчасці працы і скарачэннем залішняй занятасці (сёння яна ацэньваецца як пяць працэнтаў ад спісачнай колькасці работнікаў). А змяншэнне ўзроўню занятасці ў гаспадарцы звязваюць са скарачэннем колькасці насельніцтва ў сельскай мясцовасці.

Што да нядаўна створаных працоўных месцаў, то за першы квартал на такія вакансіі было ўладкавана 15,7 тысячы чалавек (амаль на пяць працэнтаў больш, чым устаноўлена заданнем). Усяго за гэты год плануюць увесці новыя месцы для 70 тысяч работнікаў. Адметна, што на створаных вакансіях сярэднямесячны заробак склаў 957 рублёў, што ў 1,3 раза больш, чым па краіне ў цэлым. А выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ і паслуг на аднаго супрацоўніка, задзейнічанага на новым месцы, склала ў студзені — сакавіку 33,3 тысячы рублёў, у той час калі ў сярэднім па эканоміцы гэты паказчык — 22,9 тысячы.

Але ўжо некалькі месяцаў запар колькасць звольненых перавышае колькасць прынятых на работу. У маі, напрыклад, было ўладкавана 48,2 тысячы чалавек, а звольнена 62,6 тысячы.

***— Чаму захоўваецца такая тэндэнцыя, нягледзячы на рост прапаноў на рынку?***

— Адны прадпрыемствы ствараюцца, іншыя ліквідуюцца — пастаянны рух. Людзі, магчыма, незадаволены тымі месцамі, якія ёсць, шукаюць іншыя, — разважае Алег Токун. — І безумоўна, важнае значэнне тут мае дэмаграфічны фактар. Працэнтаў на 80 сітуацыя абумоўлена ім. Мы знаходзімся ў тым перыядзе, калі больш людзей выходзіць на пенсію, чым прыходзіць на рынак працы.

## Што будзе з дапамогай?

Важнае пытанне сёння — падтрымка людзей, якія засталіся без работы. Зразумела, што дапамога па беспрацоўі ў тым выглядзе, у якім яна цяпер ёсць (а гэта максімум 46 рублёў у месяц), сваю задачу не выконвае. Чакалася, што да прыняцця страхавання ад беспрацоўя дапамогу павысяць да памеру пражытковага мінімуму — 183 рублёў. Але ў выніку ад гэтага варыянта адмовіліся.

Цяпер усе сілы скіраваны на распрацоўку страхавых прынцыпаў. Пакуль не вырашана, як будзе фарміравацца страхавы фонд: за чый кошт, у якіх памерах. Але дапамога будзе дастаткова высокай — у межах ад 50 да 70 працэнтаў ад сярэдняга заробку работніка. Па прагнозах, страхаванне ад беспрацоўя ўвядуць у краіне не раней за 2019 год.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

### ❍ У ТЭМУ

**Тамара КРАСОЎСКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях:**

— Пры садзейнічанні працаўладкаванню на ўжо адкрытыя вакансіі павінен быць індывідуальны падыход. Асабліва гэта датычыцца людзей, якія не могуць канкурыраваць на роўных. Мы мадэрнізуем вытворчасць, уводзім новыя тэхналогіі на прадпрыемствах — там патрабуюцца высокакваліфікаваныя спецыялісты. А што рабіць астатнім?

Трэба, каб мясцовыя органы ўлады вывучалі запатрабаваныя прафесіі на рынку і арганізоўвалі па іх перанавучанне. Калі, напрыклад, на заводзе чакаецца аптымізацыя, можна аператыўна адпраўляць работнікаў на перападрыхтоўку.

Важна весці інфармацыйную работу, тлумачыць людзям усе гарантыі, арыентаваць на здзяйсненне легальнай дзейнасці.

Мне хацелася б, каб дзяржаўная праграма па садзейнічанні занятасці штогод карэкціравалася ў частцы выдзялення бюджэту на месцах. Павінна быць больш грошай, каб мерапрыемствы па працаўладкаванні мелі эфектыўныя вынікі. У цэлым у нас добрая праграма. Галоўнае — забяспечыць яе рэалізацыю.

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

# МЕСЦЫ ЁСЦЬ, АЛЕ З ПРАЦАЙ НАПРУЖАННЕ

**ХОЦІМСК — адзін з самых аддаленых населеных пунктаў Магілёўскай вобласці. Каб дабрацца да яго з абласнога цэнтра, трэба правесці ў дарозе 4 гадзіны. Затое да Расіі на сваім аўто прыкладна за паўгадзіны даедзеш. Не дзіўна, што насельніцтва актыўна гэтым карыстаецца і выбіраецца туды на заробкі. Працаўладкавацца ў раёне, па сутнасці, магчыма. На сайце райвыканкама значыцца каля ста вакансій. Але, як высветлілася, чалавеку без кваліфікацыі нешта падабраць праблематычна.**

Самыя буйныя прадпрыемствы ў гарадскім пасёлку — жылкамгас ды райспажыўкааперацыя, дзе працуюць больш чым па 200 чалавек. У раёне таксама пяць больш-менш буйных аграгаспадарак. Плюс адукацыйная і сацыяльная сферы, дзе заўсёды ў дэфіцыце настаўнікі і ўрачы. Але людзей такіх прафесій сярод беспрацоўных наогул няма.

Па дарозе ў райвыканкам паспяваю пагутарыць з выпадковымі мінакамі. Пытанне пра працу для тутэйшых балючае. «Мой знаёмы ўжо сем гадоў не можна працаўладкавацца, — шчыра кажа жанчына. — Па адукацыі электрык, хадзіў у жылкамгас, ПМК — усюды разводзяць рукамі, маўляў, няма работы. Яму ўсяго 36 гадоў, ездзіць на заробкі ў Расію. А што рабіць? І такіх палова Хоцімска».

Пра вакансіі, якія знаходзяцца на сайце, жанчына адгукаецца вельмі крытычна: «Як ні звернешся, толькі і чуеш — нічога няма, чакайце», — кажа яна.

— Хто хоча працаваць, той работу сабе знойдзе, — выказваецца яшчэ адна жанчына. І з ёй усе пагаджаюцца. Праўда, пра вакансіі, якія прапануюцца на сайце райвыканкама, выказваюцца скептычна. «Стала тэлефанаваць, пытацца, а мне прапаноўваюць 0,5 стаўкі пастуха ў Батаеве, — кажа прадпрымальніца. — Хто ж туды за паўстаўкі паедзе? А адзін знаёмы пайшоў вартаўніком у Бяседавічы за 180 рублёў, потым зарплату зрэзалі, а работы дабавілі. Ноч пільнуй капусту, а калі нешта ўкрадуць, заплаціш удвайне».

Ішла пасля гэтых размоў у райвыканкам і ўяўляла, як пад дзвярыма тутэйшага цэнтра занятасці сядзяць людзі і чакаюць, калі нешта прыдатнае ім прапануюць. Але памылілася — ніводнага чалавека.

— З самай раніцы некалькі чалавек было, — кажа **галоўны спецыяліст упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Хоцімскага райвыканкама Зоя ФРАЛОВА.**



У райвыканкаме кожны беспрацоўны на ўліку.

У гандлёвым цэнтры пакупнікоў няшмат. І маё з'яўленне ўсяляе ў прадаўцоў дадатковую надзею. Мне гатовы прапанаваць тавар нават з растэрміноўкай на тры месяцы. Толькі б што-небудзь купіла.

— Тавар прадаём у доўг, трэба ж неяк на хлеб зарабляць, — прызнаецца адна з прадаўшчыц. — Плюс свае бульба, агуркі, у некаторых — качкі, свінні, каровы. Так і жывём. Людзі ў нас небагатыя, а тыя, хто больш зарабляе, едуць атаварвацца ў Расію. У нас па 500 рублёў толькі начальнікі атрымліваюць. У мяне вунь нявестка не працуе, у знаёмай — дачка.

— З іх 4 навучэнцы, якія на канікулах хочуць падзарабіць, і хлопец пасля арміі. Сам ён з вёскі Бяседавічы, толькі месяц як дэмабілізаваўся, прыйшоў працаўладкоўвацца. Па адукацыі малады чалавек слесар-рамонтнік, скончыў у Магілёве прафесійна-тэхнічны каледж. Але пакуль па яго спецыяльнасці нічога няма. Далі яму накіраванне на хоцімскі льнозавод памочнікам камбайнера. А там, магчыма, нешта і больш прыдатнае падвернецца.

У раёне пражывае болей за 10,6 тысячы чалавек, і амаль палова з іх — працаздольнага ўзросту.

У спісы непрацуючых па выніках 2015 года трапілі 403 чалавекі. Па словах **начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Хоцімскага райвыканкама Аляксея ФЕДАРЦОВА,** практычна ніхто з гэтых людзей па дапамогу


Зоя ФРАЛОВА: «Выдаваць накіраванне на працу чарговаму беспрацоўнаму заўсёды прыемна».

у працаўладкаванні раней не звяртаўся.

— Да Расіі ад нас 50 кіламетраў, больш за палову ездзяць туды працаваць, — кажа Аляксей Уладзіміравіч. — Пра тыя грошы, што ім тут прапануюць, яны і чуць не жадаюць. Сярэдняя зарплата па раёне за чэрвень — 553,6 рубля. Але большасць работаўцаў прапануе ў сярэднім 265 рублёў. Такія грошы некаторыя ў Расіі за два тыдні зарабляюць.

Пасля таго як з непрацуючай катэгорыяй насельніцтва была праведзена адпаведная работа, палову з кандыдатаў ва ўтрыманцы ўсё ж працаўладкавалі. Камусьці прапанавалі ўзяць субсідыю на сваю справу, кагосьці перанавучылі.

Праблема яшчэ і ў тым, што больш за палову вакансій разлічана на людзей з вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. А такіх, на жаль, няшмат. З працоўных прафесій часцей за ўсё не хапае жывёлаводаў або механізатараў, але, як кажуць у райвыканкаме, людзі не вельмі спяшаюцца ўладкоўвацца на такую работу. Трэба шмат працаваць, а заробак не заўсёды дастойны.

— Калі зарплата 300 рублёў і больш, працаўладкоўваем, а пра меншае людзі не жадаюць нават і чуць, — кажа начальнік упраўлення. — Пытаемся: а на што вы жывяце? Большасць утрымліваюць бацькі, дзядулі, бабулі, жонка альбо муж. Некаторыя жывуць за кошт дапамогі па інваліднасці або выпадковых заробкаў.

«Па дарозе ў райвыканкам паспяваю пагутарыць з выпадковымі мінакамі. Пытанне пра працу для тутэйшых балючае.

Чуткі пра новыя вакансіі распаўсюджваюцца ў Хоцімску хутчэй, чым іх даюць кадравікі. Дэфіцытныя месцы адразу ж запаўняюцца. Цяпер вось шмат хто з жанчын ускладае надзеі на супрацоўніцтва з вядомым вытворцам жаночай бялізны, прадпрыемствам «Мілавіца» — у Хоцімску хутка паявіцца нешта накшталт яго філіяла.

— Адна наша жыхарка звярнулася да нас з прапановай адкрыць такую швейную вытворчасць, — расказвае **намеснік старшыні райвыканкама па эканоміцы Андрэй ДАНІЛЕНКА.** — Яна выйшла на прадпрыемства, і перад ёй паставілі задачу знайсці


Андрэй ДАНІЛЕНКА: «Раёну не хапае ініцыятыўных людзей».

прыдатнае памяшканне, аформіцца ў якасці юрыдычнай асобы і падабраць кадры. Прадпрыемства забяспечвае абсталяваннем і праводзіць навучанне людзей. Плюс робіць заказы, пастаўляе сыравіну, потым забірае прадукцыю і разлічваецца. Вытворчасць ужо зарэгістравана. Цяпер ідзе набор работніц. Патрэбна мінімум 25 чалавек, аптымальная колькасць — 50. Мы, са свайго боку, падшукалі памяшканне і перадалі яго прадпрымальніцы ў бязвыплатнае карыстанне на 3 гады з магчымасцю падаўжэння дагавора яшчэ на 2 гады. Мясцовая ўлада сама зацікаўлена, каб у раёне адкрываліся новыя вытворчасці і з'яўляліся працоўныя месцы.

Андрэй Васілевіч не хавае, што з падобнымі прапановамі да раённых улад звяртаюцца не часта. Раён адзін з сямі, які ўвайшоў у праграму па развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна. Але прэферэнцыі, якія прапануюцца тут патэнцыйным інвестарам, не вельмі іх вабяць апошніх.

— Мы ездзілі ў сумежныя раёны Расіі, сустракаліся з кіраўнікамі адміністрацый, запрашалі прадстаўнікоў бізнес-колаў, паказвалі, што можам прапанаваць, але ў нас няма нічога такога, чаго б не было ў іх, — уздыхае намеснік старшыні райвыканкама. — І нават ільготы і прэферэнцыі не дапамагаюць. Яны не настолькі сур'ёзныя, каб прыцягнуць дзелавых людзей. Есць раёны з пункту гледжання лагістыкі больш прывабныя. У нас чыгункі няма, 200 кіламетраў да Магілёва, 450 — да Мінска, вострая нястача кваліфікаваных кадраў, транспартныя выдаткі — усё гэта адбіваецца. Прадпрымальным людзям нявыгадна.

Сярод сваіх шукаць інвестараў таксама цяжка. Прадпрымальніцтвам не кожны яшчэ зможа і займацца. У асноўным усе ідуць у гандаль. Сур'ёзных вытворчасцяў не адкрываюць, бо няма стартавага капіталу.

